УДК 930 (476) (1921–1939)

***Л.В. Лаўрэенка***
*аспірантка каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

# ДАСЛЕДАВАННЕ ПРАМЫСЛОВАЙ, РАМЕСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ І ГАНДЛЮ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1921–1939 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

*У артыкуле разглядаюцца падыходы ў айчыннай гістарыяграфіі да вывучэння прамысловай, раменай вытворчасці і гандлю ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. Зроблены аналіз і абагульненне асноўных прац, прысвечаных даследуемай праблематыцы. Адзначаецца гістарыяграфічная важнасць прац айчынных аўтараў, і робіцца выснова аб недастатковым даследаванні эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст. У навуковы ўжытак уведзены новыя матэрыялы, якія з'явіліся ў выніку апрацоўкі асобных фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь (г. Мінск), аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Я. Коласа НАН Рэспублікі Беларусь (г. Мінск), Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, Пінскага музея Беларускага Палесся.*

## Уводзіны

Эканамічная гісторыя з'яўляецца адной з асноўных крыніц фактычнага і метадалагічнага забеспячэння ўсіх раздзелаў эканамічнай навукі. Яна дае магчымасць уявіць карціну гістарычнага руху ад мінулага да сённяшняга часу, без чаго немагчыма ўбачыць доўгатэрміновыя тэндэнцыі эканамічнага развіцця.

Даследаванне сацыяльна-эканамічнага развіцця заходнебеларускіх зямель патрабуе аб'ектыўнага навуковага вывучэння і асэнсавання сучаснымі айчыннымі навукоўцамі. На нашу думку, без гісторыі эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. немагчыма скласці поўную карціну развіцця заходнебеларускіх зямель у перыяд іх уваходжання ў склад Польскай дзяржавы. На сённяшні момант найбольш поўна даследаваны толькі праблемы сельскай гаспадаркі і нацыянальна-культурнага жыцця Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. ХХ ст. У сувязі з гэтым вывучэнне прамысловай і раменай вытворчасці, гандлю як састаўных частак эканамічнага развіцця заходнебеларускіх земляў з'яўляецца актуальным для сучаснай гістарычнай навукі.

Улічваючы слабую распрацаванасць праблемы развіцця прамысловасці, рамяства і гандлю заходнебеларускіх зямель ў 1921–1939 гг., пастаўлена наступная мэта – вывучэнне праблемы развіцця прамысловасці, рамяства і гандлю Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. у айчыннай гістарыяграфіі. Для дасягнення пастаўленай мэты былі вылучаны наступныя задачы: 1) даць агульную характарыстыку праблеме сацыяльна-эканамічнага развіцця заходнебеларускіх зямель у 20–30-я гг. ХХ ст.; 2) прааналізаваць асноўныя працы па даследуемай тэматыцы; 3) раскрыць ступень даследавання праблемы развіцця прамысловасці, рамяства і гандлю Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. ў сучасных айчынных гістарычных даследаваннях.

## Даследаванне прамысловай, раменай вытворчасці і гандлю Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. у айчыннай гістарыяграфіі

Вывучэнне агульнага эканамічнага становішча заходнебеларускіх зямель пачалося яшчэ ў даваенныя дзесяцігоддзі. Камісія АН БССР па вывучэнні Заходняй Беларусі і Заходні сектар Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП(б)Б рабілі акцэнт на вывучэнні сацыяльна-палітычнага становішча заходнебеларускіх зямель у складзе Польшчы, а эканамічнае развіццё разглядалася ў кантэксце сацыяльна-палітычных працэсаў.

---

Навуковы кіраўнік – А.М. Вабішчэвіч, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі славянскіх народаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна

Сярод прац, у якіх фрагментарна закраналіся пытанні і прысутнічаў аналіз агульнага эканамічнага развіцця заходнебеларускага краю, неабходна адзначыць працы А. Беразоўскага, П. Гарбацэвіча, Г. Ягорава, М. Лучаніна, А. Сталевіча, Л. Родзевіча, Л. Якаўлева, А. Гака, Ф. Кона, У. Мінаева, Р. Мінскага, Г. Аляксандрава, М. Ціхамірава, А. Іванова, Л. Мануйлава [1–14]. У гэтых даследаваннях Заходняя Беларусь прадстаўлялася аграрна-сыравінным прыдаткам Польшчы, нацыянальныя багацці якой эксплуатаваліся, а самі тэрыторыі і іх насельніцтва знаходзілася ў складаных умовах для існавання. На думку гэтых аўтараў, польскія ўлады свядома праводзілі эканамічную палітыку, нацэленую на пераапрацоўку мясцовай сыравіны і экспарт яе за мяжу. Прызнаваўся аграрны характар эканамічнага развіцця заходнебеларускіх зямель.

Сярод айчынных даследаванняў, якія адлюстроўваюць асобныя аспекты тэмы, неабходна адзначыць працы В. Фрышмана і Я. Шнейдэра [15; 16], у якіх на аснове польскіх статыстычных крыніц, справаздач прамыслова-гандлёвай палаты і перыядычнага друку дадзена агульная характарыстыка прамысловай вытворчасці Заходняй Беларусі. Праца В. Фрышмана «Прамысловасць Заходняй Беларусі» з’яўляецца апісаннем прамысловасці Заходняй Беларусі па галінах: статыстыка прадпрыемстваў, удзельная вага асобнай галіны ў прамысловым развіцці ўсёй Польшчы, статыстычнае параўнанне з даваенным перыядам, аб'ёмы вытворчасці і прадукцыі, некаторыя звесткі пра становішча працоўных і іх статыстыка. Аўтарам былі лепш даследаваны дзве найбольш развітыя на заходнебеларускіх землях галіны прамысловасці – дрэваапрацоўчая і тэкстыльная. Аднак у працы найбольш поўна апісаны толькі перыяд з 1929 па 1932 гг. па прычыне адсутнасці справаздач Віленскай гандлёва-прамысловай палаты за іншыя гады і недаступнасці іншых крыніц.

Я. Шнейдэр у сваёй кнізе «Нарыс размяшчэння прамысловасці Заходняй Беларусі» даў характарыстыку асноўным галінам прамысловасці Заходняй Беларусі. Спецыфікай дадзенай працы з’яўляецца тое, што на аснове дадзеных афіцыйнай польскай статыстыкі Я. Шнейдэр зрабіў дыферэнцыяцыю і апісаў заходнебеларускую прамысловасць па прамысловых цэнтрах і акругах. Так, аўтарам прамысловасць Заходняй Беларусі была раздзелена наступным чынам: 1) прамысловыя акругі – буйны прамысловы горад і шэраг прамысловых мястэчкаў і вёсак вакол яго, якія разам з горадам складалі адно цэлае, дзе пераважала адна галіна прамысловасці (Беластоцкі, Віленскі, Белавежскі) ці прамысловы цэнтр, дзе вядучая галіна прамысловасці сканцэнтравана ў самым горадзе (Гродна, Ліда, Пінск і да т.п.); 2) прамысловыя «гнёзды» з больш ці менш буйнымі прадпрыемствамі (Падрось, Нёман, Івацэвічы і інш.); 3) прамысловасць, злучаная з сельскай гаспадаркай у найбольш развітых маёнтках Заходняй Беларусі. Заводы і фабрыкі ў дадзеных маёнтках (млыны, піваварныя заводы і бровары) перапрацоўвалі сельскагаспадарчыя прадукты ці працавалі на мясцовай сыравіне (цагельні, лесапілкі). Некаторыя маёнткі мелі па некалькі прамысловых прадпрыемстваў. Да найбольш значных прамысловых цэнтраў Заходняй Беларусі аўтар адносіў Беласток, Вільню, Гайнаўку, Гародню, Пінск і Ліду [16, с. 16–17].

У 1940-я гады працы па гісторыі Заходняй Беларусі І.Ф. Лочмеля, Н.М. Нікольскага, Ц. Гарбунова, І. Гальдштэйна, А. Абрамава, К. Венскага [17–20], якія змяшчалі асобныя звесткі па эканамічным развіцці заходнебеларускіх зямель, мелі ідэалагічны, прапагандысцкі характар і былі накіраваны на пашырэнне ў працоўных ідэі аб пазітыўным характары ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР.

Розныя аспекты эканамічнай гісторыі заходнебеларускіх зямель разглядаліся У.А. Палуянам, А.М. Мацко, П.З. Савачкіным [21; 22] і інш. А.М. Мацко ў сваёй працы становішча заходнебеларускай эканомікі разглядаў даволі фрагментарна, а менавіта ў русле барацьбы працоўных за свае правы. Залежнасць польскай эканомікі ад замежнага капітала высвятлялася ў працы П.З. Савачкіна. Аўтар рабіў акцэнт на тым, што ўся

польская эканоміка была пабудавана на замежным капітале. У даследаваннях А.А. Сарокіна, Б.Я. Кухарава [23; 24] аналізавалася эксплуататарская эканамічная палітыка польскіх улад адносна заходнебеларускага сялянства.

У 70-я гг. XX ст. у калектыўных выданнях па гісторыі Беларусі, акрамя пытанняў барацьбы за сацыяльнае вызваленне і ўз'яднанне з БССР, увага надавалася і даследаванню сацыяльна-эканамічнага становішча заходнебеларускіх зямель [25–27]. У гэты перыяд з'яўляюцца першыя калектыўныя працы па эканамічнай гісторыі Беларусі [28; 29], сутнасць якіх зводзілася ў большай ступені да параўнання эканомік Заходняй Беларусі і БССР. У дадзеных працах эканамічная гісторыя Заходняй Беларусі асвятлялася толькі ў аглядавым плане.

Адной з найбольш грунтоўных прац па даследуемай тэматыцы была дысертацыя С.І. Наркевіч [30], у якой аўтар разглядала стан прамысловасці Заходняй Беларусі ў перыяд яе знаходжання ў складзе Польшчы. Важнае месца ў дысертацыі адводзілася вывучэнню ўплыву замежнага капіталу і буйнага землеўладання на прамысловае развіццё заходнебеларускага краю. У працы назіраюцца характэрныя для савецкай гістарычнай навукі класавыя і партыйныя прыярытэты. Аўтар неаднаразова акцэнтавала ўвагу на тым, што палітыка польскіх улад была накіравана на стварэнне неспрыяльных умоў для развіцця заходнебеларускай прамысловасці, а сама Заходняя Беларусь з'яўлялася выгадным рынкам збыту польскіх тавараў.

У 1975 г. ў сектары эканамічнай гісторыі Інстытута эканомікі АН БССР пад рэдакцыяй В.І. Дрыца выйшла праца «Развіццё эканомікі Беларусі ў 1928–1941 гады» [29]. У кнізе адносна поўна прадстаўлена развіццё асноўных галін эканомікі Савецкай Беларусі – прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту і гандлю, а таксама фінансава-крэдытных адносін, пытанне гандлёвых адносін на заходнебеларускіх землях аўтарамі не было ўзята да ўвагі. Усе звесткі пра заходнебеларускі гандаль зведзены да згадвання, што далучэнне Заходняй Беларусі прывяло да росту ў 1939–1940-х гг. гандлёвага абароту.

Пачынаючы з 1990-х гг. у айчыннай гістарычнай навуцы назіраюцца змены ў метадалогіі даследавання гісторыі Заходняй Беларусі, з'яўляюцца новыя тэматычныя напрамкі, у навуковы абарот уводзяцца новыя, недаступныя раней дакументы і матэрыялы. Выходзіць шэраг калектыўных прац, якія разглядаюць гісторыю Заходняй Беларусі 20–30-х гг. XX ст. Так, у 2 частцы «Нарысаў Беларусі» [31] эканамічнае становішча заходнебеларускага краю разглядаецца даволі павярхоўна. Паказваецца, што эканамічная палітыка польскіх улад была скіравана на тое, каб пакінуць заходнебеларускія землі ў становішчы аграрна-сыравіннага прыдатку больш развітых раёнаў карэннай Польшчы. Акрамя гэтага, У.А. Палуян робіць выснову, што эканоміка Заходняй Беларусі насіла рысы, характэрныя для адсталых напаўкаланіяльных краін. У 2 частцы «Гісторыі Беларусі» [32] пад рэдакцыяй Я.К. Новіка і Г.С. Марцуля сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускага краю асветлена тэзісна.

У 1991 г. выйшла кніга І.В. Палуяна «Заходняя Беларусь у перыяд эканамічнага крызісу. 1929–1933 гг.» [33], у якой на аснове шырокага кола крыніц даследаваўся стан толькі дзвюх галін эканомікі – прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў гады сусветнага эканамічнага крызісу. Асноўная ўвага ў даследаванні надаецца становішчу рабочых і сялян, а таксама іх барацьбе за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, дзейнасці КПЗБ і нацыянал-дэмакратычным арганізацыям беларускага народу. У вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй В.І. Галубовіча [34] у агульным плане разглядаецца прамысловае развіццё, сельская гаспадарка і матэрыяльнае становішча насельніцва заходнебеларускіх зямель у 1921–1939 гады.

Асобныя аспекты гандлёвых адносін на тэрыторыі Палескага ваяводства ў 20–30-я гг. XX ст. разглядаліся ў шэрагу артыкулаў В.У Шапяцюка, В.А. Лабачэўскай,

В. Церабунь [35–38] і інш. В.У. Шапяцюк на аснове архіўных крыніц паспрабаваў выявіць спецыфіку яўрэйскага гандлю і вызначыў асноўныя тэндэнцыі ў яго развіцці. Яўрэйскі гандаль быў пераважна дробнатаварны і меў прыватнаўласніцкі характар. Аўтарам таксама разгледзена праблема ўдзелу яўрэйскага насельніцтва ў прамысловым развіцці заходнебеларускага краю. В.А. Лабачэўская разглядала Палескія кірмашы як фактар этнакультурнага развіцця беларусаў у 20–30-х гг. ХХ ст. Г.В. Церабунь у сваім артыкуле апісвала арганізацыю і правядзенне ўсіх 4-х Палескіх кірмашоў.

У манаграфіі В.А. Лабачэўскай «Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі» [40] на аснове шматлікіх польскіх крыніц і архіўных матэрыялаў даецца характарыстыка агульнага стану заходнебеларускіх народных промыслаў і рамёстваў. Аўтар паказвае, што народныя майстры атрымлівалі падтрымку ад мясцовых улад, якія разглядалі розныя праявы народнага мастацтва не толькі як рэгіянальныя, але і як агульнапольскія каштоўнасці. Папулярызацыяй беларускіх народных промыслаў займаліся Таварыствы дапамогі народным промыслам, якія ўдзельнічалі ў вырашэнні таксама і гандлёвых спраў па наладжванні збыту вырабаў народных майстроў. У даследаванні змяшчаюцца звесткі аб Віленскім, Навагрудскім і Брэсцкім базарах народных промыслаў, асартыменце рэалізуемага тавару і прыводзяцца сумы гандлёвых абаротаў. Асобныя звесткі аб рамястве і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях змяшчаюцца ў артыкуле Г. Каспяровіч і В. Каспяровіч [41].

Я.А. Броўкін у артыкуле «Эканоміка Польшчы ў 1921–1939 гг.» [42] разглядаў пытанні развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці, удзелу Польшчы ў знешнім гандлі, інвестыцыйнай палітыкі польскіх кіруючых колаў. Аўтар адзначаў, што Польшча вызначалася рознымі ўзроўнямі эканамічнага развіцця асобных рэгіёнаў, сярод якіх найбольш адсталымі былі «ўсходнія крэсы». Эканамічная палітыка Польскай дзяржавы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. знайшла адлюстраванне ў артыкулах І.І. Коўкеля, М.Б. Сямёнчыка [43; 44].

М.Б. Сямёнчык у сваім дысертацыйным даследаванні ажыцявіў аналіз стану прамысловасці Заходняй Беларусі і ўплыву на яе развіццё эканамічнай палітыкі Польшчы. У якасці асаблівасцей заходнебеларускай прамысловасці аўтар вылучаў наступныя: залежнасць ад знешніх рынкаў і агульнапольскіх сіндыкатаў; перавага ў агульным аб'ёме прадукцыі дробных прадпрыемстваў; значнае пераўзыходжанне прадукцыі сельскай гаспадаркі над прамысловай; арыентацыя на перапрацоўку мясцовай сыравіны і інш. [45].

У апошнія гады айчынныя даследчыкі пачынаюць звяртацца да праблемы вывучэння гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі. На гэтым этапе з'яўляюцца працы, у якіх прадметам даследавання быў удзел яўрэйскага насельніцтва ў сацыяльна-эканамічным жыцці заходнебеларускага краю. Жыццю і дзейнасці яўрэяў у асобных мястэчках прысвечаны артыкулы С. Піваварчыка, Э. Корзуна, В. Сліўкіна [46–48]. Таксама неабходна выдзеліць працу вядомага беларускага даследчыка Э.Р. Ёфэ [49], які зрабіў спробу аналізу гісторыі яўрэйскага насельніцтва з XIV да ХХ ст. Гэтая праца прадстаўляе вялікую значнасць, бо змяшчае не толькі статыстычныя дадзеныя пра колькасць яўрэяў, якія пражывалі ў гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі ў 20–30 гг. ХХ ст., але і звесткі пра іх асноўныя заняткі. Асобныя звесткі аб удзеле яўрэяў у эканамічным развіцці заходнебеларускіх зямель можна сустрэць у працах Я. Разенблата і І. Яленскай [50].

Сацыяльна-эканамічнае развіццё асобных мясцовасцей разглядалі ў сваіх артыкулах У. Здановіч, К. Лазіцкая, С. Токць, Ю.Н. Іваноў, Т.М. Тахіян [51–55]. Адметнасцю дадзеных артыкулаў з'яўляецца тое, што аўтары пры вывучэнні дадзенай праблематыкі выкарыстоўвалі новыя метадалагічныя падыходы, таксама была пашырана крыніцазнаўчая база.

Эканамічную думку заходнебеларускага краю ў даследуемы перыяд адлюстроўвае калектыўная праца В.М. Бусько, Б.С. Вайцяшэнка, С.І. Якімчанка [56]. У ёй аўтары

звяртаюць увагу на развіццё кааперацыі Заходняй Беларусі. Зроблена выснова аб тым, што распрацоўка мерапрыемстваў, па павышэнні ўзроўню вытворчых сіл вялася насуперак адсутнасці дзяржаўнай падтрымкі.

На сучасным этапе у асноўных калектыўных выданнях па гісторыі Беларусі, а таксама ў зборніках канферэнцый, прысвечаных вывучэнню сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы знайшлі адлюстраванне новыя канцэптуальныя падыходы і раней неапублікаваныя крыніцы. А. Вабішчэвіч, У. Палуян у 5-м томе 6-томнай «Гісторыі Беларусі» [57] пад рэдакцыяй М.П. Касцюка на аснове шырокага кола разнастайных крыніц прааналізавалі эканамічнае жыццё заходнебеларускага краю ва ўмовах паланізацыі. Дадзена характарыстыка не толькі прамысловасці і сельскай гаспадарцы, але і рамеснай вытворчасці, транспарту, падаткаабкладанню, становішчу гарадскіх рабочых і рамеснікаў. У асобным параграфе аўтарамі разглядаліся ўмовы жыцця сялян і сельскагаспадарчых рабочых. Менавіта там утрымліваюцца фрагментарныя звесткі аб гандлёвых адносінах на заходнебеларускіх землях.

М.Б. Несцяровіч у сваім артыкуле «Характар заходнебеларускай эканомікі ў 1921–1939 гадах» [58] сацыяльна-эканамічнае становішча заходнебеларускіх зямель разглядае даволі тэзісна.

Г.С. Вайцешчык у асобным раздзеле сваёй кандыдацкай дысертацыі разглядала асноўныя формы ўнутранага гандлю заходнебеларускіх мястэчак. Аўтар адзначала, што гэтыя паселішчы Заходняй Беларусі былі цэнтрамі ўнутранага гандлю і забяспечвалі штодзённыя патрэбы насельніцтва мястэчка і вёскі. Унутраны гандаль у заходнебеларускіх мястэчках у 1921–1939 гг. ажыццяўляўся ў кірмашовай, базарнай, разносна-развознай і стацыянарнай формах [59]. У сваім артыкуле «Роля яўрэяў у эканамічным развіцці мястэчак Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гадах» [60] Г.С. Вайцешчык дае ацэнку той ролі, якую ігралі яўрэі ў прамысловасці, рамястве і гандлі. Аўтар робіць выснову, што яўрэйскія купцы, рамеснікі і прамысловыя прадпрымальнікі манапалізавалі асноўныя галіны эканомікі заходнебеларускіх зямель у 1921–1939 гг. Аўтар таксама аналізуе сацыяльна-эканамічнае развіццё мястэчак Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг., вызначае іх месца ў сістэме населеных пунктаў Віленшчыны, а таксама асноўныя кірункі і формы развіцця местачковай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і гандлю [61].

У 2012 г. выйшла калектыўная праца «Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання» [62], у якой упершыню на велізарным дакументальным матэрыяле са шматлікіх замежных і айчынных архіваў даследуецца гісторыя г. Пінска ад старажытнага часу да сучаснасці. У кнізе даецца ацэнка гаспадарча-эканамічнага стану горада ў 20–30-я гг. XX ст. Гандалёвыя адносіны на тэрыторыі г. Пінска аўтарамі разглядаюцца ў якасці састаўной часткі паўсядзённага жыцця гараджан.

**Заключэнне**

1. На працягу дзесяцігоддзяў заходнебеларуская праблематыка 20–30-х гг. XX ст. з'яўлялася аб'ектам даследаванняў у айчыннай гістарычнай навуцы, але прадметам вывучэння былі ў асноўным розныя бакі грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі ў час яе ўваходжання ў склад Польшчы. Ідэалагізаваныя канцэптуальныя падыходы і асабліва недаступнасць архіўных крыніц перашкаджалі ўсебаковаму вывучэнню ў беларускай савецкай гістарычнай навуцы сацыяльна-эканамічнага жыцця заходнебеларускага насельніцтва. Асноўная ўвага надавалася пытанням гісторыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага руху.

2. Амаль усе сучасныя даследаванні па гісторыі заходнебеларускага рэгіёна захоўваюць некаторыя папярэднія канцэптуальныя падыходы ў адлюстраванні сацыяльна-эканамічнага жыцця заходнебеларускіх зямель з пазіцыі тагачасных дзяржаўных ін-

тарэсаў. У беларускай савецкай гістарычнай навуцы стан прамысловасці, рамесніцкай вытворчасці і гандлёвай дзейнасці раскрываліся ў працах даследчыкаў толькі ў агульным плане сацыяльна-эканамічнага жыцця заходнебеларускіх жыхароў, фрагментарна і выключна ў кантэксце барацьбы заходнебеларускага насельніцтва за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Улічваючы пераважна аграрны характар эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі, асноўны акцэнт рабіўся на вывучэнне сельскай гаспадаркі, аграрных адносін.

3. У айчыннай гістарычнай навуцы пакуль няма сістэмнага даследавання з прадстаўленнем цэласнай карціны прамыслова-рамесніцкай вытворчасці і гандлю Заходняй Беларусі ў 20–30-я гг. XX ст. на падставе новых гістарычных крыніц і разнастайнай навукова-метадалагічнай базы. Адзінкавыя працы, прысвечаныя прамысловасці Заходняй Беларусі, заснаваны на даволі абмежаванай базе крыніц, ўяўляюць у асноўным статыстычныя справаздачы і не паказваюць рэальнае месца прамысловай вытворчасці ў гаспадарчым жыцці. Прамысловыя рамёствы, гандаль у заходнебеларускім краі не з'яўляліся пакуль прадметам асобных гістарычных даследаванняў айчынных вучоных. Не даследавалася дзейнасць прамысловых прадпрыемстваў і рамесніцкіх майстэрняў, гандлёвых устаноў у гарадах, мястэчках і вёсках у кантэксце сацыяльных працэсаў, узаемасувязі з падатковай і інвестыцыйнай палітыкай органаў мясцовага кіравання, польскай адміністрацыі ўсіх узроўняў, уплыў этнаканфісіянальнага фактару, што не дазваляла стварыць цэластную карціну паўсядзённага побыту жыхароў заходнебеларускіх зямель у 1921–1939 гг.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Беразоўскі, А. Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў / А. Беразоўскі. – Мінск : ЦК Мопра БССР, 1928. – 45 с.
2. Гарбацэвіч, П. Паланізацыя Заходняй Беларусі / П. Гарбацэвіч. – Мінск, 1932. – 23 с.
3. Егоров, Г. Западная Белоруссия / Г. Егоров. – Минск : ОГИЗ, 1939. – 40 с.
4. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваннем Польшчы / М. Лучанін. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 55 с.
5. Родзевіч, Л. І. Заходняя Беларусь – калонія Польшчы / Л. І. Родзевіч, А. Сталевіч. – Мінск : Выд-ва ЦК МОПР БССР, 1930. – 48 с.
6. Якаўлеў, Л. Заходняя Беларусь / Л. Якаўлеў. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1931. – 88 с.
7. Гак, Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Л. Гак. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, Партмассектар, 1933. – 95 с.
8. Кон, Ф. Я. Западная Белоруссия – колония панской Польши (к процессу над белорусской громадой) / Ф. Я. Кон. – М. : Изд-во ЦК МОПР СССР, 1928. – 38 с.
9. Минаев, В. Западная Белоруссия и Западная Украина под гнётом панской Польши / В. Минаев. – М. : Воениздат, 1939. – 48 с.
10. Минский, Г. Под игом польских панов / Г. Минский. – М. : Социал.-экон. изд-во, 1939. – 95 с.
11. Александров, Г. О хозяйственном, политическом и культурном упадке польского государства / Г. Александров // Большевик. – 1939. – № 17. – С. 43–50.
12. Тихомиров, М. Западная Украина и Западная Белоруссия / М. Тихомиров // Большевик. – 1939. – № 17. – С. 58–67.
13. Иванов, А. Западная Белоруссия. Экономический обзор / А. Иванов // Совет. Украина. – 1939. – 30 сент.

14. Мануйлов, Л. По ту сторону пограничных столбов (Экономическое положение крестьян и угнетение нацменьшинств в Польше) / Л. Мануйлов // Совет. Белоруссия. – 1939. – 1 янв.

15. Фришман, В. Промышленность Западной Белоруссии / В. Фришман. – Минск : Изд-во Белорус. акад. наук, 1934. – 133 с.

16. Шнейдер, Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдер. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1936. – 104 с.

17. Заходняя Беларусь пад панскім гнётам і яе вызваленне / пад рэд. Н. М. Нікольскага, І. Ф. Лочмеля. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1940. – 96 с.

18. Горбунов, Т. Освобождённая Западная Белоруссия / Т. Горбунов. – М. : Гос. изд-во полит. лит., 1940. – 40 с.

19. Гольдштейн, И. И. Аграрные отношения в бывшей Польше, Западной Украине и Западной Белоруссии / И. И. Гольдштейн. – М. : Гос. социал.-экон. изд-во, 1940. – 296 с.

20. Абрамов, А. Западная Украина и Западная Белоруссия / А. Абрамов, К. Венский. – М. : Изд-во Ленингр. гор. совета депутатов трудящихся, 1940. – 50 с.

21. Мацко, А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнёта буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Мінск : Беларусь, 1972. – 336 с.

22. Савочкин, П. З. Экономическая экспансия иностранного капитала в Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / П. З. Савочкин // Уч. зап. БГУ. – Минск, 1957. – Вып. 36 : Вопр. ист. БССР. – С. 31–43.

23. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 199 с.

24. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Мінск : Выш. шк., 1975. – 112 с.

25. История Белорусской ССР : в 2 т. / под общ. ред. Л. С. Абецедарского. – 2-е изд., доп. – Минск : Изд-во АН БССР, 1961. – Т. 2. – 702 с.

26. История Белорусской ССР / Г. В. Штыхов [и др.] ; АН БССР, Ин-т истории ; редкол.: И. М. Игнатенко [и др.]. – Минск : Наука и техника, 1977. – 632 с.

27. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / Ін-т гісторыі Акад. навук БССР ; гал. рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972–1975. – Т. 4 : Беларусь напярэдадні і ў гады Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза (1938–1945 гг.) / рэдкал.: І. С. Краўчанка (гал. рэд.) [і інш.]. – 1975. – 640 с.

28. Развитие экономики Белоруссии в 1921–1927 гг. / под ред. В. И. Дрица. – Минск : Наука и техника, 1973.

29. Развитие экономики Белоруссии в 1928–1941 гг. / под ред. В. И. Дрица. – Минск : Наука и техника, 1975. – 335 с.

30. Наркевич, С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : автореф. дис. ... канд. экон. наук / С. И. Наркевич. – Минск, 1965. – 22 с.

31. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2 ч. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1994–1995. – Ч. 2. – 560 с.

32. Гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. Я. К. Новіка, Г. С. Марцуля. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2 : люты 1917 г. – 1997 г. – 464 с.

33. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса. 1929–1933 гг. / И. В. Полуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.

34. Эканамічная гісторыя Беларусі : вучэб. дапам. / В. І. Галубовіч [і інш.] ; пад агул. рэд. В. І. Галубовіча. – 2-е выд. – Мінск : Экаперспектыва, 1995. – 432 с.

35. Шепетюк, В. В. Участие еврейского населения в промышленном производстве Полесского воеводства в межвоенный период (1921–1939) / В. В. Шепетюк // Моладзь Берасцейшыны : зб. студенц. навук. прац. – Брэст, 1998. – С. 36–40.

36. Шепетюк, В. В. Участие еврейского населения в формировании и функционировании торговых отношений на территории Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / В. В. Шепетюк // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. – Брэст, 1998. – Ч. 2. – С. 162–167.

37. Лабачэўская, В. А. Палескія кірмашы ў Пінску / В. Лабачэўская // Загароддзе-2 : матэрыялы навук.-краязн. канф. «Палессе – скрыжаванне культур і часу», Пінск, 25–27 верас. 1999 г. / уклад. і агульн. рэд. Ф. Д. Клімчука, В. А. Лабачэўскай. – Мінск : Тэхналогія, 2000. – С. 45–50.

38. Terebuń, A. W. Jarmarki poleskie w Pińsku w latach 1936–1938 / A. W. Terebuń // Białostocczyzna. – 1999. – № 2. – S. 53–60.

39. Беразоўскі, А. Заходняя Беларусь пад пятой польскіх акупантаў / А. Беразоўскі. – Мінск : ЦК Мопра БССР, 1928. – 45 с.

40. Лабачэўская, В. А. Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 375 с.

41. Каспяровіч, Г. І. Промыслы і рамёствы беларусаў у XX ст. / Г. І. Каспяровіч, В. А. Каспяровіч // Вес. Акад. навук Беларусі, Сер. гуманітар. навук. – 1995. – № 3. – С. 105–113.

42. Броўкін, Я. А. Эканоміка Польшчы ў 1921–1929 гг. / Я. А. Броўкін // Беларус. гіст. часопіс. – 1997. – № 3. – С. 25–31.

43. Коўкель, І. І. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) / І. І. Коўкель // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. – Мінск : БДУ, 2000. – С. 16–24.

44. Сямёнчык, М. Б. Эканамічная палітыка Польшчы ў Заходняй Беларусі / М. Б. Сямёнчык // Шлях у навуку : матэрыялы 7-й рэсп. навук.-практ. канф., прысвечанай 40-годдзю студэнц. навук.-краязн. гуртка Гродз. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. – Мінск : БелНДІДАС, 1997. – С. 49–53.

45. Сямёнчык, М. Б. Рабочы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939) : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. наук / М. Б. Сямёнчык. – Мінск, 2000. – 16 с.

46. Пивоварчик, С. Гродненские евреи: хронология событий / С. Пивоварчик // Евреи Гродно: Очерки истории и культуры. – Гродно : Белорус. гос. музей истории религии ; Гродн. еврейский общинный дом Менора, 2000. – С. 5–19.

47. Корзун, Э. Яўрэі мястэчка Гальшаны / Э. Корзун // Куфэрак Віленшчыны. – 2000. – № 2. – С. 61–64.

48. Сливкин, В. Мир еврейских местечек. Лида / В. Сливкин // АВИВ. – 2003, январь – февраль.

49. Иоффе Э. Г. Страницы истории евреев Беларуси (XIV–XXвв.) / Э. Г. Иоффе. – Минск : АРТИ-ФЕКС, 1996. – 292 с.

50. Розенблат, Е. С. Пинские евреи. 1939–1941 гг. / Е. С. Розенблат, И. Э. Еленская. – Брест, 1997. – 312 с.

51. Здановіч, У. В. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Валовельскай гміны ў 1921–1939 гг. / У. В. Здановіч // Берасцейскі хранограф : зб. навук. прац. – Вып. 4. – Брест : Академия, 2004. – С. 60–63.

52. Лазіцкая, К. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Століншчыны пад уладай Польшчы / К. Лазіцкая // Назаўсёды разам: гісторыя нацыянальна-дзяржаўнага станаўлення Беларусі : да 65-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР : матэрыялы Рэсп. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 28 верас. 2004 г. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2004. – С. 160–164.

53. Токць, С. М. Скідзель у міжваеннай польскай дзяржаве (1921–1939 гг.) / С. М. Токць, А. Вашкевіч, Д. Люцік // Скідзель. 500 год гісторыі ; рэлкал.: Я. Я. Васілеўскі, А. І. Вітко [і інш.]. – Гродна, 2008.

54. Иванов, Ю. Н. Социально-экономическое развитие Волковыского повета в 20–30 гг. ХХ в. / Ю. Н. Иванов // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў : збор навук. арт. – Гродна, ГрДУ, 2006. – С. 250–254.

55. Тахіян, Т. М. Умовы развіцця сельскай гаспадаркі, прамысловасці і гандлю на землях Івацэвіччыны ў 1921–1939 гг. / Т. М. Тахіян // Осень 1939 г.: коренной перелом в судьбе белорусского народа : материалы регион. науч. практ. конф., посвященной 70-летию воссоединения Западной Беларуси с БССР, Брест, 24–25 сент. 2009 г. / ред.: Н. Н. Ковалева, Л. Ю. Малыхина. – Брест : БрГТУ, 2009. – С. 192–197.

56. Бусько, В. И. Экономическая мысль Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / В. И. Бусько, Б. С. Вайтешенко, С. И. Якимченко ; под науч. ред. П. Г. Никитенко. – Минск : Право и экономика, 2004. – 158 с.

57. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2006–2011. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.

58. Нестерович, Н. Б. Характер западнобелорусской экономики в 1921–1939 гг. / Н. Б. Нестерович // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краяхнаўцаў : зб. навук. арт. / Гродз. дярж. ун-т ; рэдкал.: І. П. Крэнь [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2006. – С. 228–232.

59. Вайцешчык, Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / Г. С. Вайцешчык. – Гродна, 2013. – 143 с.

60. Войтещик, А. С. Роль евреев в экономическом развитии местечек Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / А. С. Войтещик // Тирош: труды по иудаике. – М. : Сефер, 2011. – С. 173–180.

61. Вайцешчык, Г. С. Сацыяльна-эканамічнае развіццё мястэчкаў Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг. / Г. С. Вайцешчык // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2012. – № 2. – С. 75–84.

62. Гісторыя Пінска. Ад старажытнасці да сучаснасці: да 915-й гадавіны з першага летапіснага ўпамінання / А. М. Літвін [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2012. – 711 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 25.08.2016

***Lavreenko L.V.*** **Investigation of Industrial and Handicraft Production and Trade of Western Belarus in 1921–1939 in Belarusian Historiography**

*The article discusses approaches in Belarussian historiography to the study of industrial, handicraft production and trade in Western Belarus in 1921–1939. The authors made the analysis and summary of the main works devoted to the study subject. The article notes the historiographical importance of the works of local authors and makes the conclution about insufficient study of economic history of Western Belarus in the 20–30-th years of the XX century. The scientific treatment includes new materials, which appeared as a result of the processing of individual funds of the National Library of Belarus (Minsk), department of rare books and manuscripts of CSL named after Yakub Kolas National Academy of Sciences of Belarus (Minsk), the Brest Regional Gorky Library (Brest), Pinsk museum of Belarusian Polesie (Pinsk).*